***Вашчула Е. В.***

**ЛЕКІЭКАЛОГІЯ**

***Кансультант выкладчы Кутас В. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускідзяржаўны медычны ўніверсітэт, г. Мінск*

Немагчыма ўявіць сучаснае грамадства без выкарыстання лекаў. Як вядома, большасць сучасных лекавых сродкаў з'яўляюцца або зусім чужымі для чалавека рэчывамі, або сінтэтычнымі аналагамі біялагічна актыўных рэчываў чалавечага арганізма. Улічваючы, што аб'ём спажывання лекаў у свецерасце, яны ператварыліся ў важную крыніцу забруджання навакольнага асяроддзя. Рэчывы, якія выводзяцца з арганізма,паступаюць у вадуўжо як забруджвальнікі і могуць трапляць у арганізм чалавека. Напрыклад, нядаўна сцверджана, што падземныя пітныя крыніцына курортах Альп атручаны трыццаццю відамі найбольш распаўсюджаных лекаў.

Даволі шырокі набор лекаўёсць у кожнайсям'і. Адной з крыніцзабруджаннянавакольнагаасяроддзялекаміз'яўляеццапобытаваезабруджанне. Па заканчэнні тэрміну захоўвання яны паступаюць на смецце выязвалкі, адкультрапляюць у глебавыя воды і пітныя крыніцы.

Многія лекі валодаюць пабочным дзеяннем. Так, у ЗША лік смяротных выпадкаў ад пабочных эфектаў медыцынскіхпрэпаратаў выйшаў на чацвёртае месца пасля захворванняў сэрца, анкалагічнай паталогіі і інсультаў. Ёсць публікацыі, паводле якіх, сляды хімічных злучэнняў, што ўваходзяць у склад супраць зачаткавых таблетак, антыдэпрэсантаў, антыбіётыкаў, гарманальных прэпаратаў і іншых лекаў, выяўлены не толькі ў прыродных вадаёмах (рэкі, азёры, сажалкі), але і ў водаправоднай вадзе.

Канец XX і пачатак XXI стагоддзяў – гэта перыяд атрымання мноства новых лекаў. Больш за 90% сучасных медыкаментаў з'явілася ў апошнія 30-40 гадоў. Кожнае хімічнае злучэнне, створанае штучным шляхам, зноў з'яўляецца ў выглядзе дамешкаў у раслінах, у мясе жывёл, у арганізме чалавека, у мінералах, вадзе, паветры. Адзначана, што больш за палову лекаў, якія мы прымаем, пакідаюць арганізм у біялагічна актыўнай форме, практычна не губляючы сваіх уласцівасцяў.

Не варта забываць, што пры вытворчасці лекаў, апроч мэтавых прадуктаў, у навакольнае асяроддзе паступаюць выточныя злучэнні, пабочныя прадукты, растваральнікі і г.д. Усё гэта пагаршае экалагічныя наступствы.

Нельга не адзначыць таксама праблемаў экалагічнага характару, звязаных з атрыманнем лекаў з дзікарослых лекавых раслін, ужываннем і ўтылізацыяй лекаў, праблемаў, звязаных з выкарыстаннем у медыцыне радыеактыўных ізатопаў і інш.